ВЫДАННЕ АСВЕТНІКАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Настаўніцкая газета

6 кастрычніка 2012 года

**Дзень настаўніка не застаўся не заўважаным і ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце. Напярэдадні свята ў адным са студэнцкіх інтэрнатаў прайшло ток-шоу "Настаўнік заўсёды мае рацыю". І калі ў пачатку мерапрыемства назва гучала з пытальнай інтанацыяй, з адценнем сумнення, то напрыканцы — як упэўненае сцвярджэнне!**



Экспертная камісія.

# Настаўнік заўсёды мае рацыю

## Усе мы былі вучнямі

Больш лагічным было б пабачыць такое ток-шоу ў педагагічным універсітэце, дзе і свята, і тэма мерапрыемства напрамую звязаны з будучай прафесіяй студэнтаў. Але ў аграрным тэхнічным універсітэце знайшлі іншыя падставы адзначыць прафесійнае свята настаўнікаў.

— Усе мы некалі былі вучнямі, мелі любімых настаўнікаў. Акрамя таго, у нашым універсітэце ёсць педагогі, якія працавалі ў школах, іх мы і запрасілі расказаць студэнтам аб сваім настаўніцкім мінулым. Плануем таксама абмеркаваць педагагічныя праблемы, якія ўзнікаюць паміж настаўнікам і вучнем, выкладчыкам і студэнтам, — расказаў напярэдадні ток-шоу адзін з яго арганізатараў загадчык культмасавага сектара студэнцкага клуба ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДАТУ Генадзь Лявонцьевіч Трубач.

Па словах спецыяліста, Дзень настаўніка ва ўніверсітэце адзначаюць штогод. Летась, напрыклад, правялі ток-шоу пад назвай "100 пытанняў да настаўніка". Дарэчы, форма ток-шоу ва ўніверсітэце выкарыстоўваецца даволі часта, напрыклад, для абмеркавання праблемы маладзёжных субкультур, шкодных звычак, ужывання нецэнзурнай лексікі, — відавочна, што ў БДАТУ сочаць за здароўем і культурным узроўнем студэнтаў.



Адзін з вядучых — студэнт аўтамеханічнага факультэта Арцём Залескі — дэкламуе верш.



## Змяніць школу на ВНУ

У якасці экспертаў на ток-шоу запрасілі загадчыцу і выхавальнікаў інтэрнатаў, супрацоўнікаў сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы, а ўзначаліла экспертную камісію начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДАТУ Таццяна Мікалаеўна Вашчаева.

Усе эксперты аказаліся вопытнымі людзьмі, многія з якіх пачыналі сваю педагагічную дзейнасць менавіта ў школах, некаторыя маюць вялізны стаж настаўніцкай работы. Вось, напрыклад, выхавальнік інтэрната № 7 Тамара Аляксандраўна Жых была настаўніцай рускай мовы і літаратуры 25 гадоў і згадвае той час як самы лепшы перыяд свайго жыцця. А загадчыца інтэрната № 3 Вольга Сцяпанаўна Бядрыцкая 28 гадоў працавала настаўнікам матэматыкі!

Эксперты расказалі, чаму выбралі менавіта настаўніцкую прафесію, згадалі свае першыя ўрокі, цяжкасці здабывання "настаўніцкага хлеба", прыступкі кар'ернай лесвіцы. Што прымусіла іх змяніць школу на ВНУ? Жаданне мяняцца, развівацца, расці, а таксама розныя жыццёвыя абставіны. Адно агульнае: ніхто аб тым не пашкадаваў, як і аб тым, што некалі вырашыў прысвяціць сябе педагагічнай дзейнасці.

## Калі ў вас канфлікт з выкладчыкам...

Значную частку ток-шоу прысвяцілі папярэджванню канфліктных сітуацый у перыяд вучобы. Высветлілася, што ў студэнтаў і выкладчыкаў зусім розныя погляды на канфлікт.

— Калі ў вас канфлікт з выкладчыкам, спачатку высвятліце, ці ведае ён аб гэтым? Магчыма, проста вы не хочаце выконваць тыя патрабаванні, якія педагог прад'яўляе да студэнтаў? — паўжартам заўважыла педагог-псіхолаг сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы ўніверсітэта Маргарыта Аркадзьеўна Драбаценка.

Спецыяліст лічыць, што найбольш частая прычына непаразумення студэнтаў і выкладчыкаў — гэта крытэрыі ацэнкі ведаў, якія, зразумела, у кожнага свае. Гэтая прычына цесна звязана з яшчэ адной — суб'ектыўнае, прадузятае стаўленне выкладчыка да студэнта.

— Паверце, калі выкладчык першы раз заходзіць у аўдыторыю, яго адносіны да студэнтаў яшчэ не сфарміраваны, і складваюцца яны ўжо ў працэсе зносін у залежнасці ад таго, як кожны з вас ставіцца да прадмета, вучобы, асабіста да выкладчыка. Таму вы можаце ўплываць на стаўленне выкладчыка да вас, — параіла студэнтам Маргарыта Аркадзьеўна.

Канфліктныя сітуацыі могуць узнікаць і на глебе культуры паводзін, правілаў пражывання ў інтэрнатах. У гэтым кантэксце начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю Таццяна Мікалаеўна Вашчаева нагадала, што БДАТУ — гэта "зона, свабодная ад курэння", і дала свой рэцэпт вырашэння рознагалосся: толькі спакойна і толькі мірным шляхам.

У выпадку сур'ёзных канфліктаў заўсёды можна звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў — куратара, педагога-псіхолага, выхавальніка. Усе яны настаўнікі.

— Настаўнік — гэта не толькі чалавек, які стаіць ля дошкі ці за кафедрай і вучыць. Настаўнікі суправаджаюць вас усё жыццё, гэта старэйшыя людзі, якія знаходзяцца побач, дапамагаюць, падказваюць, раяць. Магчыма, і не адразу, але вы зразумееце, што яны маюць рацыю, — заключыла педагог-псіхолаг М.А.Драбаценка.

## Жарты ад педагогаў БДАТУ

Напрыканцы ток-шоу эксперты вельмі ажывілі аўдыторыю смешнымі гісторыямі са свайго педагагічнага вопыту.

Таццяна Мікалаеўна Вашчаева, якая, акрамя таго, што кіруе ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, выкладае сацыялогію, згадала такі выпадак. У аднаго студэнта выкладчыца спыталася, якія ён ведае традыцыйныя беларускія святы. "Новы год", — адказаў той пасля доўгага роздуму. "А перад ім якое свята?" — было наступнае пытанне. "23 лютага", — адказаў студэнт.

— У школе на адкрытым уроку ў 6 класе я пытаўся ў вучняў, кім працуюць іх бацькі, — расказаў настаўнік нямецкай мовы ў мінулым, а зараз загадчык культмасавым сектарам студэнцкага клуба Генадзь Лявонцьевіч Трубач. — У некага бацькі аказаліся аграномамі, у некага — інжынерамі. А адзін вучань доўга не мог вымавіць прафесію таты, але ў рэшце выдаў: "Mein Vater ist ... бензапіліст!".

Загадчыца інтэрната Вольга Сцяпанаўна Бядрыцкая, у мінулым настаўнік матэматыкі, расказала, як адзін з яе руплівых вучняў правучыў двух хуліганаў, якія перашкаджалі яму вучыцца. "Сіямскія блізняты" (так празвалі іх клас) на ўроку ўвесь час штурхалі доўгімі нагамі стул выдатніка, які сядзеў перад імі. Настаўніца заўважыла, як выдатнік увесь час нешта быццам бы ненаўмысна кідае на падлогу, а потым нахіляецца пад парту, каб падняць. Урэшце, калі яна выклікала да дошкі аднаго з "сіямскіх блізнят", усё стала зразумела: шнуркі іх бацінак аказаліся звязанымі паміж сабой!

Настаўніца рускай мовы і літаратуры, а цяпер выхавальнік Тамара Аляксандраўна Жых, згадала, як спрабавала на экзамене выцягнуць хаця б на тройку вельмі слабага вучня. Экзаменатар папрасіла назваць яго шыпячыя гукі. "У рускай мове ёсць шыпячыя "д", "т", — упэўнена адрапартаваў вучань. "Сяргей, няма такіх гукаў", — сказала настаўніца. "Будуць, Тамара Аляксандраўна!" — не разгубіўся той. У выніку хлопец атрымаў сваю тройку. За знаходлівасць.

**Іна НІКІЦЕНКА.**
*nikitsenka@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**